

ЗІГЗАГІ КАР'ЕРЫ ЧЭМПІЁНКІ 5



СПЕКТАКЛІ — АНЛАЙН І БЯСПЛАТНА 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СУБОТА

№ 114 (29228)


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ПЕРАЖЫВЁМ. НЕ ТАКОЕ ПЕРАЖЫВАЛІ»

**Падчас рабочай паездкі ў Полацк Прэзідэнт выказаўся не толькі па пытаннях ЖКГ, якія былі асноўнай тэмай візіту, але і па іншых аспектах жыцця, што сёння хвалююць і цікавяць людзей**

**Учора кіраўнік дзяржавы пабываў у цэнтры Еўропы. Беларускім, тым, што на поўначы, — у Полацку. Кампліментаў ад першай асобы жыхары самага старажытнага беларускага горада пачулі шмат. У прыватнасці, ідучы па скверы паміж райвыканкамам і былым гарвыканкамам і пачуўшы ад старшыні Савета Рэспублікі, палачанкі Наталлі Качанавай, што гэта ўлюбёнае месца гараджан для адпачынку, Прэзідэнт пагадзіўся: «Чаму не адпачываць? Чысты горад, жыві — не хачу... Полацк, Тураў — гэта жамчужыны».**



Фота БелТА.

## ТЭМА, ПРАДЫКТАВАНАЯ ЖЫЦЦЁМ

Да гэтага Прэзідэнт азнаёміўся з унікальнымі ўзорамі камунальнай тэхнікі. Жыллёва-камунальная гаспадарка гэтым разам стала асноўнай тэмай візіту на Віцебшчыну. Кіраўнік дзяржавы анансаваў яе яшчэ тыдзень таму, калі прызначаў новага профільнага міністра. Машыны Аляксандр Лукашэнка ўхваліў, але падкрэсліў: галоўнае — усё павінна выкарыстоўвацца. У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу ў наступныя два-тры гады вырашыць праблему збору і перапрацоўкі бытавога смецця, заўважыўшы: ***«Гэта бязладдзе, што мы вывозім на звалкі, закопваем, ствараем горы наўкол». «Гэта адзін з кірункаў, якім трэба займацца.*** Па-першае, гэта рэнтабельна, а па-другое, мы экалогію падцягваем, ачышчаем краіну. І потым — гэта ж рабочыя месцы, і гэта сыравіна для прамысловасці».

На пачатку нарады па пытаннях развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны беларускі лідар пракаментаваў выказванні пра «вылізванне» гораду напярэдадні яго прыезду.

***«Прыехаўшы сюды, убачыўшы чысты, акуратны горад, з сабой яго не павязу. Гэта ўсё застанецца тут.*** І было б дзіўна, каб да прыезду Прэзідэнта вуліцы яшчэ не падмялі ці не пафарбавалі лаўкі, не прывялі ў парадак горад. За чвэрць стагоддзя, што я Прэзідэнтам у краіне, такога яшчэ не было. Таму не хвалюйцеся, жыхары Полацка, нічога не звязём. Нават Наталля Іванўна з сабой нічога не возьме», — жартаўліва заспакоіў Аляксандр Лукашэнка.

У кастрычніку 2017 года на рэспубліканскім семінары-нарадзе па пытаннях развіцця ЖКГ дэталёва была разгледжана работа гэтай надзвычай важнай галіны. Тады быў прыняты шэраг кардынальных рашэнняў па ўдасканаленні функцыянавання ЖКГ — камунальную сферу прызналі прыярытэтам № 1 для кіраўнікоў рэгіёнаў. Сёння, па словах Прэзідэнта, надышоў час вярнуцца да кантролю гэтых рашэнняў.

Любыя заявы, крокі і дзеянні Прэзідэнта ў перадвыбарны перыяд разглядаюцца пад лупай, заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

***«Ніякіх падводных камянёў. Проста нам трэба займацца гэтым пытаннем (вельмі важным, якое хвалюе нашых людзей)*** — мы і далей гэтым пытаннем будзем займацца», — гаворачы пра адну з найважнейшых у грамадстве сацыяльных тэм — ЖКГ, заўважыў Прэзідэнт.

Практычна ўсё насельніцтва краіны штодня карыстаецца жыллёва-камунальнымі паслугамі. І тое, наколькі людзі задаволеныя іх якасцю і даступнасцю, наўпрост уплывае на настроі ў грамадстве і такім чынам у значнай ступені фарміруе сацыяльна-палітычную абстаноўку і ўзровень даверу да дзеючай улады, працягнуў Аляксандр Лукашэнка.

У Беларусі зроблена многае ў плане празрыстасці фарміравання тарыфаў, зніжэння сабекошту і забеспячэння акупнасці практычна ўсіх відаў паслуг, павышэння надзейнасці інжынерных сетак і абсталявання, абазначыў асноўны змест дакладаў у гэтай сферы кіраўнік дзяржавы. Вельмі шмат зроблена для стварэння новай камунальнай тэхнікі.

«Па-першае, тэхніка магутная, нятанная. І не ўсё ў нас добра з абслугоўваннем гэтай тэхнікі — у ЖКГ, як і ў сельскай гаспадарцы, — тут звязана яшчэ з узроўнем падрыхтоўкі кадраў. Але гэта ўжо не будучыня, а сучаснасць, многія арганізацыі ўжо маюць такую тэхніку. І без гэтай тэхнікі няма чаго размаўляць аб парадку ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы», — упэўнены Прэзідэнт.

Беларускі лідар прывёў у прыклад айчынную распрацоўку — кампактную станцыю абезжалезвання магутнасцю да 240 кубаметраў вады ў суткі. Са з'яўленнем эксперыментальнага ўзору ў Заслаўі ўжыванне вады павялічылася ў два разы: людзі перасталі купляць бутэлькі, а сталі для прыгатавання ежы карыстацца чысцюткай вадой з-пад крана.

«Малайцы, навучыліся рабіць усё. Мы знойдзем магчымасць і прафінансаваць некаторыя праграмы, але ***галоўнае — па-чалавечы ставіцца да гэтай тэхнікі. Дарагая тэхніка патрабуе мазгоў ад кадраў пры абслугоўванні»,*** — звярнуў увагу кіраўнік Беларусі.

Другі аспект «камуналкі» — аднаўляльныя крыніцы энергіі. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што яны знаходзяцца літаральна пад нагамі: мясцовыя віды паліва — торф, шчэпкі, апілкі.

«А мы ездзім і выпрошваем прыродны газ і нафту. Вось гэта трэба выкарыстоўваць, і ў Віцебскай вобласці гэта навучыліся рабіць. ***І гэты досвед трэба распаўсюджваць на ўсю краіну. Таму што драўніны, у тым ліку такой, якая гіне, у нас сёння дастаткова.*** Малайцы, разгарнуліся па пелетах», — ухваліў стварэнне адмысловых заводаў лідар краіны.

У Беларусі масава пачалі вырабляць пелеты — попыт у Еўропе на іх велізарны. Але ва ўмовах канкурэнцыі ёсць рызыка збіць кошт і сысці ў мінус па рэнтабельнасці. Таму Аляксандр Лукашэнка прапанаваў рэалізацыю прадукцыі ўзяць у адны рукі — аб'яднаць прадпрыемствы-вытворцы ў холдынг.

## ПАДЗЕЛ СФЕР АДКАЗНАСЦІ

Прэзідэнт падкрэсліў: асноўным крытэрыем эфектыўнасці работы сістэмы ЖКГ з'яўляецца ацэнка якасці паслуг, якія аказваюцца, спажыўцом, звычайным чалавекам. І пакуль на адрас галіны чуваць крытыка, супакойвацца рана.

Прэзідэнту даводзіцца часта чуць, як начальнікі адмахваюцца ад крытыкі. Сапраўды, сярод заяўнікаў сустракаюцца «прафесійныя скаржнікі», не выключыў Аляксандр Лукашэнка. Да таго ж калі ў людзей паважнага ўзросту ёсць дарослыя здаровыя дзеці, плот райвыканкам ім не будзе рамантаваць. А вось сістэма ацяплення ці газазабеспячэння ў шматкватэрных дамах — зона адказнасці ўлад.


СТАР. 2


Ініцыятыва

# «НеШкола» вучыць і дапамагае

**Дзеці медыкаў могуць бясплатна падцягнуць веды з рэпетытарамі і замацаваць школьную праграму, калі не былі на занятках у чацвёртай чвэрці з-за эпідэміялагічнай сітуацыі. У Гомелі дабрачынны праект прадпрымальнікаў такім чынам хоча падтрымаць сем'і, у якіх бацькі змагаюцца на перадавой супраць COVID-19.**

На працягу месяца для школьнікаў — дзяцей медыцынскіх работнікаў будуць арганізаваныя анлайн-урокі па ўсіх асноўных прадметах школьнай праграмы. Навучанне праходзіць на базе анлайн-суполкі «НеШкола». Вучнямі могуць стаць школьнікі — дзеці медыкаў з любога населенага пункта Беларусі.

— Перанос школьных канікул і дамашні «каранцін», якога прытрымлівалася мая сям'я, натхнілі стварыць такі анлайн-прадукт, каб мой сын-дзевяцікласнік нарэшце захацеў вучыцца, — тлумачыць **перадгісторыю стварэння анлайн-суполкі «НеШкола» прадпрымальнік Аксана ШАЎЧЭНКА.** — Я заразіла сваёй марай яшчэ адну маму-прадпрымальніцу Аляўціну Новікаву, а потым на нас літаральна пасыпаліся званкі і паведамленні з просьбамі далучыцца да групы.

Так у Гомелі ў пачатку мая спантанна ўзнікла кааперацыя бацькоў, якія хацелі ў складчыну аплачваюць групавыя заняткі сваіх дзяцей з рэпетытарамі, але ў фармаце навучання менавіта анлайн-класаў. Набралося 60 вучняў-дзевяцікласнікаў з самых розных куткоў Беларусі.

Праз аб'явы ў сацсетках цяпер ужо куратары нечаканай навучальнай плыні — Аксана і Аляўціна — знайшлі выкладчыкаў розных прадметаў, якія звычайна займаюцца рэпетытарствам. Наладзілі камунікацыю, дамовіліся наконт аплаты і пачалі праводзіць урокі праз Zoom і Skype.

— Наша «НеШкола» — альтэрнатыва рэпетытарству, часта даволі дарагому для сямейнага бюджэту, — тлумачыць Аляўціна Новікава. — Бацькі, якія ўвашлі ў своеасаблівы кааператыў, падзяляюць фінансавую нагрузку: атрымліваецца ў некалькі разоў танней, чым за класічныя заняткі.



Аксана ШАЎЧЭНКА і Аляўціна НОВІКАВА.

Максімальны набор вучняў у такім анлайн-класе вызначылі эксперыментальным шляхам. Спачатку было па восем вучняў на аднаго настаўніка, потым спыніліся на пяці-шасці — так атрымліваецца больш якасна выкладаць матэрыял.

— У «НеШколе» неабавязкова займацца ўсімі прадметамі, можна выбраць 2-3 базавыя, астатнія вывучаць самастойна. Ёсць расклад і электронны журнал наведванняў, зваротная сувязь з настаўнікамі і дамашнія заданні, — дзеліцца гомельскі прадпрымальнік. — Мы нават не думалі, што дзецям настолькі спадабаецца такі фармат навучання, што будуць прасіць працягнуць заняткі ўлетку. Мы робім апытанні нашых вучняў, і некаторыя напісалі: не ведалі, што ўрокі фізікі ці матэматыкі могуць быць такія цікавыя


СТАР. 3


# У ЭКАЛАГІЧНЫ ПАХОД



Вучні Зялёнаборскай школы Барысаўскага раёна, якія наведваюць школьны летнік, ідуць на экскурсію на экалагічную сцежку, што знаходзіцца адразу за гарадскім пасёлкам.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Еўракамісія заклікала адкрыць унутраныя граніцы да 15 чэрвеня



Еўрапейская камісія (ЕК) лічыць магчымым зняць абмежаванні на ўнутраных граніцах краін Шэнгенскай зоны і асацыіраваных з ёй дзяржаў з 15 чэрвеня, заявіла член ЕК па ўнутраных справах Ільва Ёхансан. Па яе словах, эпідэміялагічная сітуацыя ў гэтых краінах палепшылася ў дастатковай ступені, і ўсе яны прымаюць рэкамендаваныя Еўракамісіяй прэвентыўныя меры, што дазваляе зняць абмежаванні. У той жа час, адзначыла еўракамісар, абмяркоўвалася сітуацыя на знешніх граніцах, і Еўракамісія прыйшла да высновы, што дзеючую да 15 чэрвеня забарону на неабавязковыя паездкі праз знешнія граніцыы ЕС варта падоўжыць яшчэ на два тыдні — да 30 чэрвеня. «Гэтыя абмежаванні пакуль нельга зняць адразу. Будзем гэта рабіць паступова», — растлумачыла Ёхансан. Для гэтага з улікам эпідэміялагічнай абстаноўкі будзе складзены спіс краін, з якімі ЕС пачне з 1 ліпеня адкрываць граніцы.

## Вялікабрытанія не мае намеру працягваць пераходны перыяд па «брэксіце»

Пра гэта паведаміў віцэ-прэзідэнт Еўракамісіі Мараш Шэфчавіч на прэс-канферэнцыі пасля сустрэчы спецкамітэта прадстаўнікоў ЕС і Вялікабрытаніі. Вялікабрытанія выйшла з ЕС 31 студзеня. Да канца гэтага года будзе доўжыцца пераходны перыяд, падчас якога бакі спрабуюць дамовіцца аб мадэлі сваіх будучых адносін. Цягам гэтага часу да Вялікабрытаніі працягваюць прымяняцца правілы ЕС, краіна не ўдзельнічае ў працэсе прыняцця рашэнняў у саюзе, але працягвае папаўняць агульны бюджэт Еўрасаюза. Такі пераходны перыяд дае магчымасць, напрыклад, захаваць гандлёвыя адносіны ў ранейшым фармаце. Па заканчэнні пераходу правілы саюза перастануць распаўсюджвацца на Брытанію. Каб не было перабояў і цяжкасцяў у арганізацыі адносін краіны і саюза ў розных сферах, іх прадстаўнікі павінны дамовіцца аб умовах будучага партнёрства. Перагаворы ідуць, аднак пакуль сур'ёзнага прагрэсу не назіраецца.

## Падчас пратэстаў у ЗША зносяць помнікі Калумбу

Гэтая гістарычная асоба выклікае супярэчлівыя эмоцыі ў амерыканцаў ужо шмат гадоў. Напрыклад, у 2017 годзе падумаць наконт зносу помніка Калумбу абяцаў мэр Нью-Ёрка Біл дэ Блазі. Цяпер трыгерам для новага вітка гэтых спрэчак стала хваля антырасісцкіх пратэстаў. У амерыканскім штаце Вірджынія ўдзельнікі руху супраць расізму і паліцэйскага гвалту BlackLivesMatter скінулі ў возера помнік Хрыстафору Калумбу. Статую павалілі падчас акцыі пратэсту, якая спачатку праходзіла без здарэнняў, а затым адцягнулі да вадаёма. Дэманстранты стаялі з плакатамі, якія асуджаюць забойства індзейцаў падчас каланізацыі Амерыкі: «Гэта зямля поўхатанаў», «Калумб увасабляе генацыд», перадае Euronews. Помнік Хрыстафору Калумбу трапіў пад напад і ў Бостане, дзе невядомыя абезгаловілі статую. Мэр Марці Уолш заявіў, што цяпер манумент прыбяруць з вуліцы, пасля чаго будзе арганізавана абмеркаванне гістарычнага значэння таго, што адбылося, і неабходнасці вярнуць помнік на месца. А ў Мінесоце пратэстуючыя сцягнулі з пастамента помнік Калумбу, размешчаны насупраць капітолія штата.




ISSN 1990 - 763X

20114>

9 771990 763008


## КОРАТКА

• Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка з рабочай паездкай наведаў Маладзечна. Ён азнаёміўся з дзейнасцю філіяла «Слуцкія электрычныя сеткі» РУП «Мінскэнерга» і ААТ «ЭНЭФ», а таксама сустрэўся з калектывамі прадпрыемстваў.

• **У Беларусі аднавілі ў поўным аб'ёме работу санітарнай авіяцыі.**

• На першы энергаблок БелАЭС дастаўлена перасоўная дызель-генератарная станцыя.

• **Вершы беларускіх паэтаў з'явіліся на сценах будынкаў у Горках.**

• Абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у 27 раёнах Беларусі.

Жыллёвая нерухомасць

# Працяглае «піке» квадрата

## Цэны на другасным рынку жылля сталіцы да верасня ўпадуць мінімум на 15 %




**У першыя дні лета традыцыйна прапанова на рынку нерухомасці моцна перавышае попыт. Пакупнікі дыктуюць умовы, а прадаўцы вымушаныя рабіць вялікія зніжкі, калі хочуць прадаць кватэру хутка. Пры гэтым шматлікія ўладальнікі памяшканняў да гэтага часу не ўсвядомілі маштаб «прасадкі». На думку нашага эксперта, ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, прадаўцы сталічнай нерухомасці арыентуюцца не на цану рэалізаваных здзелак, а на цэнавы шэраг аб'ектаў у продажы, выстаўляючы кватэры па іх верхніх межах. На тыя ўмовы, якія цяпер прапануюць пакупнікі, яны пакуль не ідуць. А цэны, між іншым, у Мінску ўсё падаюць...**


СТАР. 3



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З нагоды

# Выратаваць іншыя жыцці

## Міністры і чыноўнікі здавалі кроў напярэдадні Сусветнага дня донара

**Беларускі Чырвоны Крыж і РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій арганізавалі сумесную акцыю па бязвыплатнай здачы крыві «Бяспечная кроў выратоўвае жыццё», прымеркаваную да Сусветнага дня донара, які адзначаецца заўтра. У ёй узялі ўдзел нераўнадушныя беларусы, прычым сярод іх былі міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік, міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, кіраўнік беларускага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Батыр Бердыклычаў, генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга Мычко, кіраўнік офіса ЮНФПА ў Беларусі Вольга Атрошчанка, кіраўнік Савета Беларускай асацыяцыі ўрачоў Дзмітрый Шаўцоў, старшыня асацыяцыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі.**



Фота БелТА.

12 чэрвеня ў РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх тэхналогій больш людна, чым звычайна. Пасля традыцыйнай ужо апошнім часам працэдуры вымярэння тэмпературы на ўваходзе наведвальнікам прапануюць запоўніць анкету. Сярод донараў са стажам і тыя, хто прыйшоў упершыню. Напрыклад, **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**

— Гэта мой першы крок — удзел у такой акцыі. У нас даўняе і цеснае супрацоўніцтва з Чырвоным Крыжом, таму мы з работнікамі міністэрства вырашылі падтрымаць гэту ініцыятыву, здаць кроў у імя здароўя людзей, дзеля выратавання жыццяў, — падзялілася Ірына Анатолеўна.

Яшчэ адзін донар, **кіраўнік беларускага бюро СААЗ Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ,** адзначыў, што забеспячэнне якаснай і бяспечнай крывёй — дастаткова вострае пытанне ва ўсіх краінах свету, бо патрэба ў крыві і яе кампанентах штодзённая. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі гэты працэс пастаўлены на сістэмную аснову.

**Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Вольга МЫЧКО** падкрэсліла, што забор крыві ажыццяўляецца з захаваннем усіх мер бяспекі, растлумачыўшы, што сёлетняя сітуацыя не дазволіла правесці традыцыйныя выязныя мерапрыемствы. Пры гэтым каля 60 валанцёраў і супрацоўнікаў Чырвонага Крыжа пажадалі далучыцца да акцыі.

У 2019 годзе каля 100 тысяч чалавек сталі донарамі крыві, пры гэтым кожны пяты з іх — упершыню. За апошнія чатыры гады колькасць донараў у Беларусі вырасла на 15 %. Павялічылася і колькасць ганаровых донараў — іх ужо каля 65 тысяч. Штодзень у донарскія пункты па ўсёй краіне прыходзіць каля 1,5-2 тысяч чалавек.

Сёння за адну данацыю плазмы (600 мілілітраў) выплачваецца ад 150 рублёў. Пры гэтым у арганізм донара вяртаюць клеткі крыві — эрытрацыты і трамбацыты, а таксама запаўняюць фізрастворам забраны аб'ём плазмы. Донар цэльнай крыві атрымлівае 111 рублёў за адну данацыю. Акрамя таго, донар крыві і яе кампанентаў мае права на два выхадныя (у дзень данацыі і любы дзень па ўзгадненні з наймальнікам цягам двух гадоў). Гэтыя дні аплачваюцца ў памеры сярэдняга заробку за папярэднія два месяцы. Тым, хто здае кроў бязвыплатна, выплачваецца каля 24 рублёў на харчаванне, акрамя таго, донар мае права на два выхадныя дні (адзін з іх не аплачваецца).

Як расказаў **загадчык аддзялення нарыхтоўкі крыві ў выязных умовах РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Антон СВІРСКІ,** ужо каля 160 чалавек сталі донарамі імуннай плазмы, якая выкарыстоўваецца для лячэння пацыентаў з COVID-19. Некаторыя з іх ажыццявілі па дзве-тры данацыі і рыхтуюцца да чацвёртай. Ва ўсіх донараў, хто перахварэў на каранавірусную інфекцыю, у той ці іншай ступені знаходзілі антыцелы. Большасць такіх донараў здае плазму бязвыплатна.

**Алена КРАВЕЦ.**

Трывожная тэндэнцыя

# РАССЛАБЛЯЦЦА ПАКУЛЬ РАНА

## Кіраўнік беларускага бюро СААЗ папярэдзіў, што небяспека росту выпадкаў COVID-19 захоўваецца

**Беларусь усё яшчэ знаходзіцца ў стадыі лакальнай перадачы COVID-19, і сітуацыя застаецца дастаткова сур'ёзнай. Пра гэта заявіў кіраўнік беларускага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Батыр БЕРДЫКЛЫЧАЎ.**

— Мы сапраўды бачым, што з надыходам лета ў людзей назапасілася стомленасць, яны перастаюць асэнсоўваць небяспеку, якая ўсё яшчэ існуе. Гэта трывожная тэндэнцыя, бо вірус нікуды не знік, нягледзячы на пэўную стабілізацыю і зніжэнне колькасці новых выпадкаў.

Эксперт заклікаў захоўваць рэспіраторны этыкет, гігіену рук, фізічнае дыстанцыраванне і нашэнне масак.

— Гэта вельмі важна, бо ў гэты перыяд, калі людзі расслабіліся, небяспека існуе і імавернасць росту захоўваецца. Мы можам казаць пра тое, што ў віруса няма прыкмет сезоннасці, ён распаўсюджваецца і ў краінах з гарачым кліматам, таму спадзявацца, што з надыходам лета вірус сыдзе, нам не выпадае.

Батыр Бердыклычаў адзначыў, што Беларусь нарасціла патэнцыял па лабараторным тэсціраванні. І ў гэтым плане відаць пэўная стабілізацыя і зніжэнне. Але яшчэ неабходна прааналізаваць лічбы, каб вызначыць, чаму цяпер назіраецца змяншэнне колькасці новых выпадкаў. Ён адзначыў, што зрабіць прагнозы, калі можна будзе зняць маскі і жыць ранейшым жыццём, пакуль немагчыма. І параіў не расслабляцца.

— Мы можам абапірацца на вопыт іншых краін, у тым ліку постсавецкіх, дзе назіраўся дастаткова высокі ўзровень інфекцыі, фіксавалася шмат выпадкаў захворвання. Пасля ўвядзення дастаткова жорсткіх абмежавальных мер колькасць выпадкаў знізілася. Але мы бачым, што цяпер у шэрагу краін — Арменіі, Азербайджане, Паўночнай Македоніі — пасля зняцця гэтых абмежаванняў назіраецца рост колькасці новых выпадкаў. Гэта сведчыць пра тое, што насельніцтва ўсё яшчэ ўспрымальнае да віруса і неабходна камбінаваць меры стрымлівання, да якіх адносяцца тэсціраванне, ізаляцыя, лячэнне хворых і іх кантактаў, а таксама меры зніжэння шкоды. Гэта значыць, калі мы бачым, што магчымасці сістэмы аховы здароўя падыходзяць да мяжы і яна не можа справіцца з патокам пацыентаў, неабходна ўвядзенне пэўных абмежаванняў. Такім чынам, камбінацыя гэтых мер — найбольш правільны шлях, —падкрэсліў кіраўнік беларускага бюро СААЗ.

*Па звестках на 12 чэрвеня, зарэгістравана 52 520 выпадкаў COVID-19. Пры гэтым папраўіліся і выпісаны 27 760 пацыентаў, 298 чалавек памерла з пачатку распаўсюджвання інфекцыі. Праведзена 697 011 тэстаў. За апошнія суткі колькасць новых інфіцыраваных самая нізкая за апошнія паўтара месяца — 704, пры гэтым 1117 чалавек папраўіліся і выпісаны, пяцёра памерлі. За суткі праведзены 18 441 тэст.*

**Алена КРАВЕЦ.**

Гарадское асяроддзе

# САД ЦІХАГА АДПАЧЫНКУ

## Як запатрабаваны ў брастаўчан адзін з самых зялёных аб'ектаў 1000-годдзя

**Калі гадоў пяць таму ўпершыню актыўна загаварылі пра гістарычны Гарадскі сад, нават калі прайшлі першыя суботнікі па расчыстцы зараснікаў хмызняку, не вельмі і верылася, што старадаўні парк будзе адноўлены. Пра яго даўно і надзейна забывалася не адно пакаленне. Прыкрыты з боку вуліцы Леніна вялікай мемарыяльнай кампазіцыяй «Вартавым мяжы» зарослы лапік зямлі па дарозе ў крэпасць не асабліва і мазоліў вочы. Дзікі куточак прыроды ў самым цэнтры горада асобныя гараджане прызвычаілі, напрыклад, для смажання шашлыкоў. Пра гэта расказала жыхарка аднаго з суседніх дамоў.**




Фота Валерыя КАРАЛЯ.

### Ад Казённага саду да нашых дзён

На жаль, тусаваліся ў гэтым месцы не толькі культурныя кампаніі, як і на ўсялякай пустцы. А раней... сад быў улюбёным месцам адпачынку гараджан. Тут квітнелі бэз і акацыя, ружы, півоні. Сустракаліся нават экзатычныя віды раслін. Летам заўжды было шмат музыкі, працавалі кафэ, летнія сцэны, буфеты. А перад Першай сусветнай вайной у 1914 годзе ў драўляным тэатры саду іграў Сяргей Рахманінаў.

На ўваходнай браме значыцца год заснавання Гарадскога саду — 1835-ы. Менавіта ў 30-я гады XIX стагоддзя па імператарскім указе сталі ўзводзіць крэпасць. Для гэтага прыгожы старажытны Брэст знеслі і зруйнавалі, а крыху далей адбудавалі новы, што на афіцыйнай мове гучала як «перанеслі горад на іншае месца». І, відаць, каб крыху дагадзіць не задаволеным перасяленнем жыхарам, заклалі для іх месца адпачынку — Казённы сад. Так ён спачатку называўся. Пазней ён будзе мяняць назвы на парк Шапавалава, парк Свабоды і ўрэшце стане Гарадскім садам. А Шапавалаў — купец, які прабіў першую свідравіну і здабыў чыстую ваду на гэтай тэрыторыі. Дарэчы, у 1940 годзе сад закрылі для наведванняў, бо ён стаў санітарна-ахоўнай зонай гарадскога водазабора, тут размяшчаліся артэзіянскія свідравіны.

Ну а потым, у пасляваенныя пяцігодкі, пра сад забыліся, ён здзічэў і згубіўся ў гарадской прасторы. Ды знайшліся знаўцы гісторыі, энтузіясты, што абудзілі грамадскую думку ў XXI стагоддзі. Вырашальнай у гэтай сітуацыі стала падтрымка **старшыні гарвыканкама Аляксандра РАГАЧУКА,** які загарэўся ідэяй старадаўні парк адрадзіць. І хоць гэты аб'ект не ўвайшоў у пералік пазіцый па праграме святкавання тысячагоддзя, якія атрымалі фінансаванне з рэспубліканскага бюджэту, горад знайшоў сілы і сродкі добраўпарадкаваць Гарадскі сад. Яго ўрачыста адкрылі ў год святкавання юбілею Брэста.

### Сузіранне, роздум, стасункі з прыродай

Канцэпцыю аднаўлення і праект распрацавала ААТ «Брэстжылпраект». Яшчэ на стадыі праектавання дырэктар названай арганізацыі, **кіраўнік аўтарскага калектыву Таццяна МАРОЗ** расказвала, як яны карпатліва вывучалі гісторыю саду, колькі цікавых звестак знайшлі ў розных крыніцах. Паводле яе слоў, стваральнікі канцэпцыі ставілі задачу захаваць філасофію архітэктараў-папярэднікаў. У аснову яе пакладзеныя паважлівыя адносіны як да прыроды, так і да наведвальнікаў, тых, хто прыйдзе ў гэты парк. Сад задуманы зонай ціхага адпачынку без шумных забаўляльных мерапрыемстваў і адпаведных аб'ектаў. Да гэтага ж абавязвае і памяць. Ёсць звесткі, што менавіта тут пахаваныя ахвяры вайны 1812 года, а таксама Першай і Другой сусветных войнаў. Таму спецыялісты накрэслілі абноўлены сад як месца сузірання, спакойнага роздуму, стасункаў з прыродай.

І вось што мы маем. У парку пракладзены сцежкі-алеі, сюды перамясціліся старыя ліхтары. У цэнтры, на насыпе, устаноўлены камень-валун. Гэты 20-тонны гмах знайшлі на дне аднаго з вадаёмаў паўднёвай часткі горада. **Галоўны архітэктар Брэста Мікалай УЛАСЮК** сказаў, што вобраз кургана з валуном навеяны менавіта старадаўнімі капішчамі. Адно з іх было паблізу. Арнаментальную кампазіцыю, якой апаясаны камень, прапанавалі брэсцкія ковалі, яны і зрабілі «пояс» на матыў знакамітых яек Фабержэ. Забягаючы крыху наперад, скажу, што падчас устаноўкі імянных лавак, **генеральны дырэктар Брэсцкай гарадской ЖКГ Ігар СІЛЬЧАНКА** адзначыў, што на тыльным баку каменя, калі добра прыгледзецца, заўважная выява Божай Маці. Упершыню рабочыя, што ўздымалі камень, звярнулі ўвагу на выяву і расказалі. Прынамсі, над гэтым яшчэ будуць працаваць спецыялісты.

### Выхад на бераг ракі

Гарадскі сад будзе развівацца, прырастаць новымі аб'ектамі. Напрыклад, грэх не выкарыстаць факт арганізаванага выхаду да вады. Менавіта галоўная алея выводзіць падарожніка на набярэжную ракі Мухавец, дзе працягваецца актыўнае добраўпарадкаванне. Яшчэ пры першых абмеркаваннях архітэктары прапаноўвалі тут уладкаваць месца для мастакоў, дзе б яны маглі працаваць, прадаваць карціны, рабіць маленькія перасоўныя выстаўкі. Нешта накшталт набярэжнай Сены ў Парыжы, дзе творчыя людзі сядзяць проста на беразе каля вады. А на гэтым тыдні на патэнцыяльным месцы мастакоў сустрэла групу выпускнікоў з чырвонымі стужкамі. Раней так 11-класнікі хадзілі зазвычай 25 мая. Цяпер усё змясцілася, перамянілася па зразумелых прычынах. І нейкі асобны клас выйшаў для фотасесіі на набярэжную. Юнакі і дзяўчаты сядзелі каля вады, смяяліся, жартавалі, пазіравалі акурат насупраць Гарадскога саду, відаць, гэтак жа, як і іх равеснікі сто гадоў таму, бо засталося шмат паштовак, здымкаў саду пачатку XX стагоддзя.

### Адпачынак на імянных лаўках

Гэтай вясной на адной з алей саду паявіліся першыя імянныя лаўкі. Ідэю падгледзелі ў цэнтральным парку Нью-Ёрка. Там ёсць падараваныя гораду месцы адпачынку. Вось і ў нас па прапанове мэра горада як фізічныя асобы, так і арганізацыі аплацілі кошт лавак. Яны зроблены ў адзіным стылі, а вось на таблічкі кожны аўтар памясціў свой змест. Напрыклад, былы брастаўчанін, кампазітар Эдуард Ханок нагадаў сваю песню. На яго лаўцы напісана: «Как дорог край березовый в малиновой заре». Асобныя фундатары пазначылі толькі сваё імя без прозвішча з добрымі пажаданнямі гараджанам. А наогул па таблічках можна чытаць найноўшую гісторыю горада і меркаваць пра яго насельнікаў. Заўважыла, як маладжавы палкоўнік хадзіў і ўважліва вывучаў надпісы. Можа, вайсковец мае жаданне зрабіць свой унёсак у справу. Гэта можа зрабіць кожны. Варта толькі падумаць над надпісам. Напрыклад, на лаўцы СП «Санта Брэмар» накрэслена: «Мала знайсці сваё месца ў жыцці, трэба заняць яго першым», што і прадэманстравала кампанія за апошнія тры дзесяцігоддзі. «Быць дабру!» — настойвае Брэсцкі лікёра-гарэлачны завод. Хто б сумняваўся ў сказаным, толькі не тыя адпачывальнікі, якіх па выпраўцы можна было прыняць за ваенных пенсіянераў. Яны нешта разглядвалі на каленях ў таго, хто сядзеў у цэнтры, а калі мы праходзілі побач, прыкрылі газетай. Не, мы нічога не падумалі... прынамсі, гэта мог быць планшэт ці ноўтбук, можа, людзі нешта абмяркоўваюць.

А праходзілі мы разам з былой калегай Ларысай Ахрамук. Яны з мужам зараз на пенсіі і з задавальненнем гуляюць у Гарадскім садзе:

— Для нас гэты куток, як і набярэжная, месцы рэлаксу. І калі на беразе ракі цяпер мнагавата людзей, асабліва побач з дзіцячымі пляцоўкамі, спартыўнымі трэнажорамі, тут жа заўсёды нешматлюдна. У час пандэміі — самае лепшае месца для прагулак.

Маладая маці Аксана Валынчук, якая гуляла з дачкой Арынай і расказала пра шашлыкі яе школьнага юнацтва, заўважыла:

— Для адпачынку з малым дзіцем ідэальнае месца, птушачкі спяваюць, паветра чыстае. Тут мая дачка пару месяцаў таму першыя свае крокі зрабіла.

Яшчэ адна маці з дзвюма дачушкамі выказала занепакоенасць, што каля сметніц збіраюцца гурбы, менш сталі прыбіраць. Апошняе невыпадкова. У сувязі з цяперашняй эканамічнай сітуацыяй горад скарэктаваў выдаткі на асобныя галіны. Больш цяпер ідзе на медыцыну, менш на ЖКГ. Дворнікі працуюць няпоўны рабочы тыдзень. Вось і з прыборкай не заўсёды паспяваюць. Добрая нагода, дарэчы, самім гараджанам перагледзець стаўленне да асяродку. Але ж такія цяжкасці, трэба спадзявацца, часовыя. Далейшае развіццё парку — справа гадоў, а можа, і дзесяцігоддзяў. Галоўнае, што новы аб'ект патрэбны людзям як месца адпачынку і гораду як кавалачак зялёнай зоны ў цэнтры.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Працяглае «піке» квадрата

### У ЧЭРВЕНІ БУДЗЕ ЛЕПШ

Калі казаць пра сітуацыю на рынку ў цэлым, то карціна такая: у красавіку рынак асеў у два разы. Звычайна ў гэтым месяцы назіраецца 1400 здзелак, а сёлета — 700 дагавораў куплі-продажу. У маі — паводле статыстыкі (гэта пацвярджаецца звесткамі Нацыянальнага кадастравага агенцтва па колькасці дасканалых здзелак) зніжэнне яшчэ мацнейшае, але...

Калі ў красавіку гаспадары кватэр нікога да сябе не пускалі, а патэнцыйныя пакупнікі не хадзілі на прагляды — з-за пандэміі, — то ўжо з другой паловы мая сітуацыя стала змяняцца. Многія агенцтвы нерухомасці кажуць пра адчувальныя пазітыўныя тэндэнцыі. Як гэта разумець?

Магчыма, людзям проста надакучыла баяцца. Так, яны надзяваюць самыя сучасныя рэспіратары і медыцынскія пальчаткі. Але патэнцыйныя пакупнікі нерухомасці больш не стаяць убаку, а ўсё вынюхваюць і вымацваюць у кватэры. Фокус у тым, што некаторыя актыўнасці на рынку з'яўляюцца апераджальнымі на этапе заключэння папярэдняга дагавора і афармлення задатку, здзелка ж ажыццяўляецца пазней. Адсюль намеціўся попыт на фоне нізкай статыстыкі заключаных здзелак. Чэрвень толькі пачаўся, але мы ўжо бачым, што, хутчэй за ўсё, ён будзе лепшы, чым папярэднія месяцы, таму што задаткі ўжо пайшлі.

На попыт сур'ёзна ўплывае сезоннасць. Вясна і лета — гэта той час, калі актывізуецца рынак загараднага жылля. Дыстанцыяванне, самаізаляцыя і закрытыя граніцы яшчэ больш падштурхоўваюць людзей да прыняцця рашэння аб куплі загараднага дома, таму попыт (як «Звязда» ўжо пісала) у гэтым сегменце моцна актывізаваўся. На рынку назіраецца актыўны попыт на танныя загарадныя хаты, дачы і ўчасткі. Гэта не значыць, што дарагія аб'екты не купляюць, але колькасная перавага на баку бюджэтнага сегмента — ад 10 тысяч да 20 тысяч долараў.

### ЦЯПЕР АДБІВАЮЦЦА ЭКАНАМІЧНЫЯ ФАКТАРЫ

Спецыфіка яшчэ і ў тым, што на любыя эканамічныя працэсы — дэвальвацыю рубля (у адносінах да долара), іншыя макраэканамічныя падзеі — беларускі рынак нерухомасці рэагуе мацней, чым у іншых суседніх краінах. Тлумачыцца ўсё проста: калі там кошт нерухомасці прывязаны да нацыянальнай валюты, то ў Беларусі вялікая частка насельніцтва атрымлівае заробак у рублях, а купляе кватэры — у доларах. І калі адбываецца нейкі скачок, рынак не паспявае хутка адаптавацца.

Іншы момант — крэдытаванне. Следам за макраэканамічнымі з'явамі ў свеце нашы банкі пачалі перастрахоўвацца, узмацніўшы ўмовы для крэдытаатрымальнікаў, а пасля і зусім прыпыніўшы праграмы. Гэта сур'ёзна пахіснула пакупніцкую здольнасць насельніцтва. Для нас банкаўскія фінансавыя прадукты — нейкі каталізатар, які дазваляе развівацца рынку нерухомасці. У апошнія гады, калі банкі пачалі выдаваць параўнальна даступныя крэдыты, рынак актывізаваўся і доля здзелак з прыцягнутым капіталам узрасла. Як толькі крэдыты былі прыпыненыя, вялікая частка пакупнікоў выбыла. Гэта першы сур'ёзны ўдар па попыце, атрыманы цяпер рынкам другаснага жылля.

Другі ўдар па попыце — пандэмія. Ён часовы і паступова слабее, але ён ёсць. Існуе доля пакупнікоў і прадаўцоў, якія адклалі рашэнне жыллёвага пытання ў сувязі з няпростай эпідэміялагічнай сітуацыяй. Ёсць людзі, якія спынілі паказы і прагляды менавіта з-за рызыкі захварэць. Маюцца рэальныя прыклады скасавання ланцужкоў здзелак па прычыне таго, што адзін з уласнікаў занепакоіўся здароўем сваіх родных, і адмовіў канкрэтнаму пакупніку нават з рызыкай страціць сур'ёзныя грошы.

Разбяромся спачатку з напаўненнем рынку. Калі казаць пра прапанову, то яна стабільна расце. Колькасць аб'ектаў, выстаўленых на продаж, павялічваецца кожны тыдзень. На сёння ў базе партала Realt.by зарэгістравана больш за 9,1 тысячы жылых аб'ектаў, яшчэ ў сакавіку іх было каля 6 тысяч. Пачынаючы з красавіка, уласнікі заўважылі тэндэнцыі рынку і сталі выстаўляць аб'екты на продаж.

Другасны рынак папоўніўся аб'ектамі з сегмента прыватнага арэнднага жылля. Рынак нерухомасці — гэта цэласная структура, і змены ў адных кірунках несумненна ўплываюць на іншыя. Ужо ў пачатку гэтага года паралізавалася работа турызму, а разам з ім і рынак арэнды сутачных і элітных кватэр. Бізнесмены страцілі крыніцы фінансавання, і многіх з іх сітуацыя вымусіла выставіць кватэры на продаж.

### МІНІМУМ — ВОСЕННЮ

Больш актыўна ўключыліся ў працэс тыя, каму важны чысты продаж — атрыманне грошай без наступных укладанняў у нерухомасць. Для іх крытычна важна як мага хутчэй прадаць памяшканне, каб ператварыць яго ў грошы, таму што тэндэнцыя ідзе на патанненне. Яны і прапануюць самыя рыначныя цэны. І заўтра гэтыя цэны будуць ніжэйшыя, чым сярэднія цэны ўчора.

Асобныя эксперты прагназуюць абвал рынку, але наш спецыяліст прадказвае плаўнае зніжэнне. Мікалай Прасталупаў мяркуе, што гэты год асаблівы, але за капейкі нерухомасць прадавацца не будзе. Мы ўжо праходзілі не адзін крызіс і бачылі, як рынак рэагуе на складаныя эканамічныя сітуацыі. Цяпер жа вялікая колькасць людзей перайшла на скарочаны рабочы дзень, а частка работнікаў (якія былі занятыя ў сферы паслуг) наогул страцілі работу. І цэны зніжацца будуць, бо прапанову ўсё ж нараджае попыт.

Таму «чыстым» пакупнікам — тым, у каго ёсць магчымасць пачакаць — наш эксперт параіў зрабіць менавіта гэта. У выпадку, калі запланаваны шматхадовы ланцужок з вялікай колькасцю кватэр, чакаць не абавязкова, бо ўласнік выступае і прадаўцом, і пакупніком.

Па законах жанру, у нас кожнае лета пачынаецца з прастою на другасным рынку жылля: прадаўцоў шмат, а пакупнікоў амаль нуль. З такім развіццём падзей у пачатку верасня ў нас будуць мінімальныя цэны на кватэры за апошнія некалькі гадоў. Мікалай Прасталупаў лічыць, што з пачатку года да верасня зніжэнне цэннікаў на кватэры складзе каля 15 %.

### ПАНІЖЭННЕ НЕ ВЕЧНАЕ

Пакупнікам было б выгадна, каб цэны зніжаліся пастаянна, але дамовіцца не атрымліваецца. Ва ўсім вінаваты феномен адкладзенага попыту. Дапусцім, людзі прымаюць рашэнне пачакаць, але не сыходзяць з рынку. Яны будуць вырашаць свае жыллёвыя пытанні, але крыху пазней — ім усё роўна трэба пашырацца, раз'язджацца, «прыбудоўваць» дзяцей, пераязджаць. Пакупнікі проста чакаюць лепшага моманту. І бліжэй да канца лета, верагодна, кліенты «паспеюць».

На фоне зніжаных цэн і вялікага выбару адзін за адным пакупнікі пачнуць больш пільна звяртаць увагу на другасны рынак. Першая «прачнецца» найбольш імпульсіўная катэгорыя грамадзян — тыя, хто падумае: «Цяпер нядрэнны час, а як будзе далей — незразумела. Трэба браць». І здзелкі пойдуць. Відавочна, першыя пакупнікі пачнуць разбіраць лепшыя аб'екты, тым самым актывізаваўшы ўвесь рынак. Людзі, бачачы, што самыя ліквідныя прапановы адна за адной знікаюць, таксама паспяшаюцца з купляй, бо ўпусціць добры аб'ект па разумнай цане ніхто не хоча. Спыніць такі попыт можа толькі поўная адсутнасць грошай. А грошы ў многіх людзей яшчэ ёсць.

### СТАЛІЦА І РЭГІЁНЫ

За апошні тыдзень індэкс цэн на кватэры ў Мінску знізіўся на 0,3 % і склаў 1402 долара за квадратны метр. На такім узроўні цэны знаходзіліся ў пачатку 2020 года. У адрозненне ад другаснага рынку цэны на новабудоўлі ўвесь май паказвалі нязначныя ваганні. Сярэдняя цана кватэр у новабудоўлях Мінска за апошні тыдзень нязначна вырасла і складае на цяперашні момант 1312 долараў за «квадрат».

Разрыў паміж сярэднім узроўнем цэн на першасным і другасным рынках жылля складае 86 долараў за квадратны метр, што з'яўляецца мінімальным значэннем за паўгода.

У абласных цэнтрах таксама назіраецца тэндэнцыя да патаннення. Самым дарагім (пасля сталіцы) лічыцца горад Брэст — за апошні тыдзень цэннік на кватэры тут знізіўся на 0,2 % (821 долар за квадратны метр). У Гродне на 0,6 % (739 долараў), у Магілёве на 0,4 % (649 долараў), у Гомелі на 0,4 % (638 долараў) і ў Віцебску на 0,5 % (634 долараў за «квадрат»).

У буйных гарадах Мінскай вобласці сярэдні ўзровень цэн на кватэры ісці на зніжэнне яшчэ не збіраецца. У Барысаве ён нават пайшоў уверх — 610 долараў за квадратны метр (+0,3 %), тое ж і ў Салігорску — 867 долараў (+0,8 %), і ў Жодзіне — 739 долараў (+0,6 %). У Слуцку — 585 долараў (-0,1 %) і Маладзечне — 748 долараў (-0,6 %) — трохі здаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «НеШкола» вучыць і дапамагае

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З вучнямі працавалі дзесяць настаўнікаў па асноўных прадметах. Гэта выкладчыкі-рэпетытары з Гомеля, Мінска, Рагачова, Брэста.

— З 2017 года ў Гомелі дзейнічае дабрачынная валанцёрская група, удзельнікі якой — выпускнікі міжнароднай школы сацыяльнага прадпрымальніцтва Community Connections, — расказвае Аксана Шаўчэнка. — Кожную вясну мы ладзілі дабрачынны праект у падтрымку выхаванцаў дзіцячага дома-інтэрната. Але сёлета каранавірус скарэкціраваў нашы планы. Мы падрыхтавалі некалькі акцый па падтрымцы нашых медыкаў, якія знаходзяцца цяпер на перадавой нябачнай вайны з COVID-19.

Такім чынам, валанцёры прапануюць сваю дапамогу ў аплаце анлайн-урокаў «НеШколы» па базавых прадметах праграмы, на якіх будуць займацца дзеці медыцынскіх работнікаў.

— Набор вучняў адкрыты з пачатку чэрвеня. Класы для заняткаў з настаўнікамі-рэпетытарамі разлічаны на 50 школьнікаў, якія змогуць падцягнуць прапушчаны ў чацвёртай чвэрці школьны матэрыял, — адзначаюць куратары дабрачыннага праекта.

Яны запрашаюць настаўнікаў, якія хацелі б паспрабаваць свае сілы ў такой рабоце з вучнямі, далучыцца да справы. Акрамя таго, гомельскія прадпрымальнікі падрыхтавалі яшчэ некалькі дабрачынных акцый па падтрымцы медыкаў.

Так, арганізаваны «Пакет падтрымкі дашкольнікаў» — для дзяцей скамплектавана 100 набораў з развіваючымі гульнямі і дыдактычнымі матэрыяламі для самастойнай падрыхтоўкі да школы. Дабрачынная акцыя «Кава-паўза для ўрача» разлічана на тое, што на працягу чэрвеня штодня 15 набораў будуць дастаўляцца дзяжурным урачам аддзялення Гомельскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. Пакет падтрымкі «Абарона» заклікае аказаць дапамогу медыцынскім работнікам, якія непасрэдна працуюць з «ковіднымі» пацыентамі, у набыцці бескантактавых тэрмометраў, сродкаў дэзынфекцыі, масак і ахоўных павязак.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ЗА ЗДАРОЎЕМ РАСЛІН НА ПАЛЕТКАХ СОЧЫЦЬ... БЕСПІЛОТНІК

**Унікальны калектыў з функцыямі, дакладна азначанымі ўрадавымі дакументамі яшчэ ў часы СССР, належным чынам аснашчаны тэхнічна і ўкамплектаваны падрыхтаванымі кадрамі, працуе пад Мінскам, у пасёлку Прывольны — дзяржаўная ўстанова «Беларуская машынавыпрабавальная станцыя». Гэта акрэдытаваны выпрабавальны цэнтр і адначасова — орган па сертыфікацыі трактароў і сельскагаспадарчай тэхнікі. Грунтуючыся на больш чым 70-гадовым вопыце, у тым ліку на ўласным досведзе работы ў якасці філіяла Усесаюзнага інстытута павышэння кваліфікацыі Дзяржкамсельгастэхнікі СССР і былой рэспубліканскай выстаўкі новай тэхнікі, станцыя дапамагае найбольш «прасунутым» аграрыям укараняць сістэмы дакладнага земляробства. А яшчэ разам з айчыннымі сельскагаспадарчымі ВНУ з'яўляецца адным з дарадчыкаў галіновага міністэрства, а ў шэрагу выпадкаў і ўрада.**


Дырэктар Беларускай МВС Аляксандр ВАШЧУЛА.

Кіруе станцыяй выхаванец калектыву **Аляксандр ВАШЧУЛА.** Мінчанін, выпускнік Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта. На выпрабавальную станцыю трапіў па размеркаванні і прайшоў шлях ад інжынера 1 катэгорыі да дырэктара (з чэрвеня 2014 года). У кастрычніку 2010 года абараніў дысертацыю, і яму прысуджана вучоная ступень кандыдата тэхнічных навук.

Як навуковец і практык Аляксандр Уладзіміравіч лічыць, што:

- менавіта ўкараненне сістэм дакладнага земляробства дазваляе перайсці да ацэнкі і карэкціроўкі дзеючых цяпер тэхналогій;

- адна з галоўных задач любой машынавыпрабавальнай станцыі — вызначыць здольнасць машын працаваць у комплексе з іншай сучаснай тэхнікай;

- самым перспектыўным у гэтым шэрагу з'яўляецца электратрактар, бо ён дае магчымасць людзям, што сядзяць за яго рулём, ужо цяпер напоўніцу адчуваць сябе чалавекам XXI стагоддзя;

- у айчынным сельскагаспадарчым машынабудаванні найбольш бурны рост за апошні час назіраецца ў вытворчасці малагабарытнай тэхнікі і вузлоў да яе.

Свае навуковыя погляды ён выклаў разам з групай аўтараў у кнізе «Трактары XXI стагоддзя. Стан і перспектывы».

З Аляксандрам Вашчулам мы гутарым пра надзённыя клопаты Беларускай МВС. Спачатку прашу яго растлумачыць фундаментальныя, асноватворныя функцыі калектыву.

— Як акрэдытаваны выпрабавальны цэнтр станцыя 72 гады спецыялізуецца на правядзенні выпрабаванняў па паказчыках прызначэння і бяспекі машын і абсталявання для сельскагаспадарчай галіны, меліярацыйных і цеплатэхнічных машын, лесатэхнічных і дарожных машын і механізмаў, — расказвае дырэктар. — Пры гэтым улічым, што галіна акрэдытацыі выпрабавальнага цэнтра дазваляе праводзіць усе віды выпрабаванняў на адпаведнасць тэхнічным рэгламентам не толькі Беларусі, але і Еўразійскага эканамічнага саюза (Мытнага саюза). Чытаць артыкул будуць спецыялісты, таму назаву тэхнічныя рэгламенты канкрэтна: ТР МС 004/2011 «Аб бяспецы нізкавольтнага абсталявання», ТР МС 010/2011 «Аб бяспецы машын і абсталявання», ТР МС 031/2012 «Аб бяспецы сельскагаспадарчых і лесагаспадарчых трактароў і прычэпаў да іх». Не лішнім будзе падкрэсліць яшчэ раз, што цэнтр аснашчаны прафесійнымі кадрамі, якія маюць у сваім распараджэнні сучаснае абсталяванне і сродкі вымярэнняў.

А як орган па сертыфікацыі прадукцыі станцыя праводзіць поўны комплекс работ па пацвярджэнні адпаведнасці ў выглядзе сертыфікацыі і рэгістрацыі дэкларацый аб адпаведнасці тых жа машын і абсталявання для сельскай гаспадаркі, меліярацыйных і цеплатэхнічных машын, зноў жа, лесатэхнічных і дарожных машын і механізмаў патрабаванням тэхнічных рэгламентаў, у тым ліку Еўразійскага эканамічнага саюза (Мытнага саюза). У цяперашні час орган па сертыфікацыі праводзіць работы па пацвярджэнні адпаведнасці ўсім вышэйпералічаным тэхнічным рэгламентам Еўразійскага эканамічнага саюза (Мытнага саюза), да якіх яшчэ дабавіўся ТР МС 020/2011 «Электрамагнітная сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў».

Такім чынам, выдадзеныя намі сертыфікаты і дэкларацыі дзейнічаюць на ўсёй тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза (Мытнага саюза) — у Рэспубліцы Арменія, Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліцы Казахстан, Расійскай Федэрацыі, Кыргызскай Рэспубліцы.

**— Атрымліваецца, што ў сувязі са стварэннем Еўразійскага эканамічнага саюза ваш выпрабавальны цэнтр і орган па сертыфікацыі атрымалі статус міжнародных і выконваюць шэраг работ па прамых заяўках партнёраў па саюзе?**

— Менавіта так. Прывяду прыклады. Па заяўках ТАА «САМЭ Дойц-ФАР Русо» праведзены выпрабаванні і сертыфікацыя сельскагаспадарчых трактароў і іх кампанентаў (кабіна, вілка счэпная, цягавы брус), якія выпускаюцца SAME Deutz-Fahr Deutschland GmbH (Германія). Вялікі спектр работ праведзены па заяўках ТАА «Джон Дзір Русь» па выпрабаваннях і сертыфікацыі лінейкі трактароў і іх кампанентаў канцэрна John Deere, якія вырабляюцца ў ЗША, Кітаі, Расіі. Адчуваеце, якія гучаць назвы?

У цяперашні час на станцыі працягваюцца работы па ацэнцы адпаведнасці сельскагаспадарчых трактароў вядомага амерыканскага брэнда. Кампаненты трактароў у адпаведнасці з патрабаваннямі ТР МС 031/2012 «Аб бяспецы сельскагаспадарчых і лесагаспадарчых трактароў і прычэпаў да іх» ацэньваліся намі для прадпрыемстваў-вытворцаў многіх краін свету.

У прыватнасці, органам па сертыфікацыі і выпрабавальным цэнтрам праведзены работы па цэлым шэрагу іншых сельскагаспадарчых машын па заяўках арганізацый Расійскай Федэрацыі.



Вызначэнне эфектыўнасці стойкавай тармазной сістэмы. Загадчык лабараторыі ацэнкі бяспекі Іван СЕМЯНЯКА вымярае вугал уздыму платформы.

**— А што сёння, Аляксандр Уладзіміравіч?**

— У цяперашні час прапрацоўваюцца пытанні сертыфікацыі трактароў фірмы «Кубота», Японія (заводы ў Японіі і Францыі), і фірмы BCS, Італія.

**— І як вам працуецца з міжнародным статусам?**

— Што ж, канешне, гэта ганарова, але накладвае на калектыў асаблівую адказнасць. Бо нашы дакументы, нашы рашэнні і рэкамендацыі пачалі распаўсюджвацца не толькі на тэрыторыю адной краіны — Беларусі, але і на многія іншыя. Зразумела, што выкананне шэрагу работ тармозіцца з-за закрыцця граніц большасцю краін у сувязі з пандэміяй каранавіруса. Скажам, немагчыма ўвезці ўзоры машын на мытную прастору Рэспублікі Беларусь для выпрабаванняў, правесці неабходныя працэдуры на заводах-вытворцах па пацвярджэнні адпаведнасці.

**— Мы з вамі не зможам абысціся без аналізу работы калектыву ў мінулым годзе.**

— Летась намаганні калектыву былі накіраваны на падрыхтоўку і правядзенне выпрабаванняў сельскагаспадарчай тэхнікі ў адпаведнасці з планам Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, а таксама на дагаворных пачатках з распрацоўшчыкамі і вытворцамі, у тым ліку:

— на правядзенне пацвярджэння адпаведнасці і сертыфікацыйных выпрабаванняў сельскагаспадарчай тэхнікі;

— на рэцэнзаванне і ўзгадненне нарматыўнай дакументацыі на распрацоўку і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі, а таксама ТНПА.

Планам выпрабаванняў важнейшых відаў сельскагаспадарчай тэхнікі ў ДУ «Беларуская МВС» у 2019 годзе прадугледжвалася правядзенне выпрабаванняў і маніторынгу 52 узораў машын і абсталявання, у тым ліку трактароў, пагрузчыкаў і транспартных сродкаў, машын для апрацоўкі глебы, унясення ўгнаенняў і абароны раслін, машын для вырошчвання, уборкі і пасляўборачнай апрацоўкі збожжавых культур, машын для жывёлагадоўлі і кормавытворчасці, машын для механізацыі бульбаводства, пладаагародніцтва, для вырошчвання лёну.

Па 49 назвах машын выпрабаванні завершаны, па 3 — у сувязі з познім прад'яўленнем на выпрабаванні аформлены пакуль прамежкавыя справаздачы, а выпрабаванні будуць працягнуты ў 2020 годзе.

**— А якімі паказчыкамі характарызуецца ваша, скажам так, прадпрымальніцкая дзейнасць, ваша ініцыятыўнасць?**

— На дагаворных пачатках з распрацоўшчыкамі і вытворцамі на працягу года праведзены і аформлены пратаколамі (актамі, справаздачамі) выпрабаванні 227 найменняў машын і абсталявання.У мэтах пацвярджэння адпаведнасці праведзена 417 выпрабаванняў.

Гэта досыць цікавы ўчастак нашай дзейнасці, і калі казаць канкрэтна, то работа па пацвярджэнні адпаведнасці характарызуецца наступнымі паказчыкамі: выдадзена сертыфікатаў адпаведнасці — 250, зарэгістравана дэкларацый адпаведнасці — 33, праведзена перыядычных ацэнак на прадпрыемствах, што серыйна вырабляюць сертыфікаваную прадукцыю, — 74.

Наступны сур'ёзны ўчастак работы — экспертная праца, і яна характарызуецца наступнымі паказчыкамі: разгледжана 38 тэхнічных заданняў і тэхнічных умоў, 40 стандартаў і зыходных патрабаванняў.

**— Журналісты нашай газеты даволі часта пішуць пра ваш калектыў і дакладна ведаюць, што тут пастаянна ўкараняецца шмат новага і цікавага. Раскажыце пра свае тэхнічныя навінкі.**

— Прывяду толькі адзін прыклад, але досыць яркі. Апошнім часам у ДУ «Беларуская МВС» праводзяцца работы па асваенні ў сельскагаспадарчай вытворчасці беспілотных лятальных апаратаў. Намі набыты ўласны беспілотнік, спецыялісты станцыі прайшлі навучанне па яго эксплуатацыі.

Лятальны апарат выконвае аэрафотаздымкі мясцовасці, а гэта комплекс работ, які ўключае розныя этапы — ад лічбавых здымак паверхні зямлі з лятальнага апарата да атрымання лічбавых фотаздымкаў, на аснове якіх ствараюцца фотасхемы і ортафотапланы знятай мясцовасці.


Стэнд для выпрабавання распыляльнікаў на надзейнасць. Рэсурсныя выпрабаванні выконвае інжынер Антон СУЛІМЧЫК.

Пры фатаграфаванні мясцовасці выкарыстоўваецца Сістэма паветранага картаграфавання мясцовасці (СПКМ), распрацаваная дзяржаўнай навуковай установай «Фізіка-тэхнічны інстытут Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

**— Растлумачце, у чым практычная каштоўнасць цэлага набору такой суперсучаснай тэхнікі.**

— Пасля таго, як комплекс выканаў аэрафотаздымкі палёў і стварыў ортафотапланы знятай мясцовасці, на іх аснове вылічваецца індэкс NDVI (Нармалізаваны вегетацыйны індэкс). А гэта паказчык здароўя раслін, ён вызначаецца па тым, як расліны адлюстроўваюць і паглынаюць розныя светлавыя хвалі. У цяперашні час праводзяцца эксперыментальныя палёты на палях Маладзечанскай гатунковавыпрабавальнай станцыі. Напрацоўваецца матэрыял, які ўключае карты і аналізы глеб у вызначаных месцах палёў з перыядычнасцю раз на два тыдні на розных культурах для збору статыстыкі і градуіравання шкалы індэксаў NDVI.

Гэтай тэмай займаецца малады інжынер, выпускнік Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Антон Сулімчык. Выпускнікі айчынных ВНУ ў нас на прыкметных ролях.

**— Так, людзі ў вас працуюць цікавыя. Раскажыце, калі ласка, пра свой калектыў.**

— Працуе паўтары сотні чалавек, палова мужчын і палова жанчын. Ну, амаль палова, важна не гендарнае адрозненне, а тое, што іх яднае, — працуюць аднолькава старанна, прафесійна. Большасць мае вышэйшую і спецыяльную адукацыю.

Характарызуе калектыў такі факт. За даволі працяглую яго гісторыю ўтварыўся шэраг працоўных дынастый, якія працягваюцца да гэтага часу. Гэта дынастыі Асябрыкаў, Мацют, Лазоўскіх і іншыя. Хацелася б сёння падрабязней расказаць пра дынастыю Шаўлоўскіх. Васіль Васілевіч Шаўлоўскі адпрацаваў у ДУ «Беларуская (Заходняя) МВС» 46 гадоў, кіраваў машынна-трактарным паркам і рамонтнай майстэрняй. Яго жонка Кацярына Мікалаеўна больш за 30 гадоў была ў даследчай гаспадарцы станцыі ветэрынарным урачом. Цяпер ужо дваццаць першы год працуе інжынерам іх дачка Наталля Дайнека і 15 гадоў яе муж электраманцёр Віктар Яўгенавіч.

Два гады таму прыйшла на работу інжынерам пасля заканчэння БНТУ ўнучка Шаўлоўскіх Вераніка Мацкевіч. Такім чынам, калі палічыць, то агульны працоўны стаж дынастыі складае ні многа ні мала 115 гадоў.

У заключэнне Аляксандр Вашчула палічыў патрэбным зазначыць:

— Праз МВС праходзяць усе сельгасмашыны і абсталяванне, якія выпускаюцца ў краіне. Іх немалы кошт, можа быць, сёння нават не галоўнае. У першую чаргу яны павінны якасна выконваць сваё прызначэнне, быць надзейнымі і забяспечваць бяспеку тых, хто імі кіруе. Мы працуем больш чым са 140 айчыннымі прадпрыемствамі і прадпрыемствамі краін блізкага і далёкага замежжа. Гэта дазваляе адчуваць сябе ўпэўнена, ведаць, чым жывуць вытворцы сельгастэхнікі. Тым больш што Беларуская МВС сертыфікуе тэхніку не толькі з краін Еўрапейскага саюза, але і з Азіі, Амерыкі. Станоўчыя вынікі гэтай работы сталі магчымымі дзякуючы добрасумленнай і скаардынаванай працы кожнага вытворчага падраздзялення, кожнага супрацоўніка. Нам толькі 70. Узрост для МВС невялікі. Гэта, можна сказаць, толькі пачатак доўгага шляху. Працяг яе гісторыі будзе пісацца ў лабараторыях, на выпрабавальных палігонах і палях краіны — распрацоўкамі канструктараў, вытворцамі сельгасмашын і тымі, хто на іх працуе.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Вераніка АРЛОЎСКАЯ. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 600068848.

**Ад рэдакцыі.** Выказваем шчырую падзяку за рознабаковую дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу намесніку дырэктара станцыі па выпрабаваннях Ігару Мікалаевічу МАЦЮТУ і адказнаму за ідэалагічную работу Аляксандру Уладзіміравічу КЛІМЧАНКУ.


Вызначэннем знешняга шуму трактара «БЕЛАРУС 622» занята вядучы інжынер Алена МЕЛЬНІК.

## ФАКТЫ З ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ МВС

У 1948 годзе спачатку Пастановай Савета Міністраў СССР, а затым і Загадам па Міністэрству сельскай гаспадаркі СССР была арганізавана сетка з 16 занальных машынавыпрабавальных станцый, у лік якіх уваходзіла і Заходняя МВС. Ад гэтага часу вядзецца адлік яе гісторыі.

У студзені 1992 года ў сувязі з развалам СССР і набыццём суверэнітэту Рэспублікай Беларусь адбылася структурная і арганізацыйная перабудова машынавыпрабавальнай станцыі. Заходняя МВС была пераўтворана ў Беларускую МВС і падпарадкавана Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

Калі ў пачатковы перыяд дзейнасці МВС асноўнымі ацэнкавымі паказчыкамі былі тэхналагічныя, то затым разам з агратэхнічнай ацэнкай машын пачалі праводзіцца энергетычная, эксплуатацыйна-эканамічная ацэнкі, ацэнка надзейнасці, умоў працы, рамонтапрыдатнасці і іншыя віды ацэнак, якія даюць магчымасць выявіць канструктыўныя і эксплуатацыйныя вартасці і недахопы машын.

У цяперашні час на станцыі праводзяцца выпрабаванні доследных, серыйных і імпартных узораў трактароў і самаходных шасі павышанай праходнасці, балотаходных, меліярацыйных і іншых машын, глебаапрацоўчых машын, машын для вырошчвання і ўборкі бульбы, збожжавых і зернебабовых культур, машын для падрыхтоўкі і ўнясення арганічных і мінеральных угнаенняў, пагрузачна-транспартных сродкаў, машын для кормавытворчасці, а таксама для механізацыі жывёлагадоўчых фермаў.

У ДУ «Беларуская МВС» працуюць 5 галіновых лабараторый, 3 спецыялізаваныя і 8 аддзелаў.

У апошнія гады ДУ «Беларуская МВС» праведзена значная работа па рэфармаванні сваёй дзейнасці, звязанай, у прыватнасці, і з пераходам на сістэму тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, якая, з аднаго боку, дазваляе павысіць якасць прадукцыі і дасягнуць сусветнага ўзроўню, быць канкурэнтаздольнымі ў адкрытым рынку, а з другога — абараняць айчынны рынак тэхнічнымі мерамі.

У мэтах прававога забеспячэння работ па выпрабаваннях сельскагаспадарчай тэхнікі выпрабавальны цэнтр Беларускай МВС акрэдытаваны Дзяржкамстандартам РБ на тэхнічную кампетэнтнасць і незалежнасць пры правядзенні выпрабаванняў, устаноўленых галіной акрэдытацыі. Гэта стала падставай для нараджэння дэвіза калектыву: «Мы забяспечваем незалежнасць і кампетэнтнасць».

З лютага 2013 года орган па сертыфікацыі акрэдытаваны на правядзенне работ па пацвярджэнні адпаведнасці патрабаванням тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза і ўключаны ў Адзіны рэестр органаў па сертыфікацыі і выпрабавальных лабараторый (цэнтраў) Мытнага саюза.

На станцыі працуюць музей і тэхнічная бібліятэка, у якой сабрана больш за 25 тысяч нарматыўна-прававых дакументаў. Гэта найвялікшы скарб, сфарміраваны за час існавання станцыі. Па ім можна атрымаць поўную характарыстыку, дадзеную ўсім камбайнам, трактарам, касілкам, саджалкам бульбы, культыватарам, іншым відам тэхнікі, якая праходзіла праз МВС, чым часта карыстаюцца прадстаўнікі дзяржаўных органаў кіравання, спажыўцы і, вядома ж, распрацоўшчыкі сельгастэхнікі. Пры садзейнічанні Дзяржстандарту рэспублікі, Мінсельгасхарча і з удзелам саміх супрацоўнікаў станцыі ўся гэтая літаратура захавана на электронных носьбітах, што дае магчымасць аператыўна і якасна праводзіць выпрабаванні, павышаць прадукцыйнасць працы і адначасова дапамагае спецыялістам паглыбляць свае веды. Выпрабавальнікі заўсёды павінны апярэджваць час і ісці на палову кроку наперад, каб даваць аб'ектыўную ацэнку тварэнням канструктараў і вытворцаў сельгасмашын.

Пастаянным клопатам калектыву з'яўляецца пераабсталяванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. За апошнія гады ДУ «Беларуская МВС» значна абнавіла сродкі вымярэнняў і інфармацыйна-тэхнічныя сістэмы.

Тут укаранёна сістэма дыстанцыйнага кіравання выпрабаваннямі сельскагаспадарчых машын. За тысячу кіламетраў (а часам і больш) спецыялісты могуць адсочваць работу тэхнікі і прычапнога абсталявання па многіх паказчыках — удзельным спажыванні паліва, глыбіні апрацоўкі глебы, іншых параметрах. Гэта дае магчымасць скараціць транспартныя выдаткі, тэрміны правядзення выпрабаванняў, павялічыць напрацоўку тэхнікі. Ды і ў спецыялістаў з'явілася неабходнасць павышэння інтэлектуальнага ўзроўню сваёй падрыхтоўкі.

Машыны для ўнясення сродкаў абароны раслін, мінеральных угнаенняў адначасова нясуць і павышаную небяспеку для здароўя чалавека, прыроды. Для павышэння тэхнічнага і тэхналагічнага ўзроўню выпрабаванняў давялося ўкараніць сучасную сістэму, якая дазваляе дыягнаставаць усе віды такіх машын. Гэта дазволіць з большай дакладнасцю і раўнамернасцю ўносіць прэпараты, што потым спрыяльна адаб'ецца на эксплуатацыі сельскагаспадарчай тэхнікі і на экалогіі. Створана і працуе абсталяванне для выпрабаванняў тармазных сістэм. Зманціравана абсталяванне для выпрабаванняў катлоў.

Сумесна з аб'яднаным інстытутам машынабудавання НАН Беларусі ўсталяваны новы стэнд для вызначэння вугла папярочнай устойлівасці машын. У бліжэйшых машынавыпрабавальных станцый, у тым ліку і заходняй Еўропы, такіх установак няма. Гэта, можна сказаць, гонар калектыву. Абсталяванне ўжо прайшло атэстацыю, на ім вядуцца выпрабаванні велікагрузных аўтамашын і трактароў з прычэпамі, аўтобусаў, іншай сельскагаспадарчай тэхнікі.


Правядзенне экспертызы з вызначэннем паказчыкаў тэхнічнай характарыстыкі. На пярэднім плане — інжынер Раман КРЫВЕЦКІ.

## Кароткім радком

*Зыходзячы з уласнага багатага вопыту, спецыялісты Беларускай МВС лічаць, што:*

*▶ жыццё патрабуе больш уважлівага выпрабавання спачатку кампанентаў сельскагаспадарчай тэхнікі, тых жа трактароў, а ўжо потым цалкам саміх сельгасмашын, тым больш што прыняты новы адпаведны тэхнічны рэгламент патрабаванняў да трактароў і прычэпаў;*

*▶ а далей ад ацэнкі асобных машын варта пераходзіць да ацэнкі тэхналагічных комплексаў, тэхналогій. Гэта ўсё часцей становіцца палітыкай калектыву станцыі;*

*▶ пры выпрабаваннях на першы план павінны выходзіць і выходзяць пытанні бяспечнасці машын. Машына павінна першым і галоўным чынам быць бяспечнай ва ўсіх сэнсах, а ўжо потым ацэньваецца эканоміка;*

*▶ машына для эфектыўнага вырашэння вытворчых задач павінна ўваходзіць у сям'ю іншых машын, з'яўляцца часткай вытворчай сістэмы.*

*Толькі тады эканоміка атрымаецца станоўчая.*


Узяць «інтэрв'ю» ў трактара. Вызначэнне ўзроўню знешняга шуму «БЕЛАРУСА 622».


Працэсам падрыхтоўкі да вызначэння нагрузкі на колы трактара займаецца інжынер Дзмітрый ЛІСАЙ.

К@нтыненты

# Зубы ветру

## Чым пагражае глабальнае нашэсце саранчы?



**Сусветны банк зацвердзіў рашэнне, згодна з якім выдзеліць рэкордныя 500 мільёнаў долараў на барацьбу з нашэсцем саранчы ў краінах Афрыкі і Блізкага Усходу. Фінансавая дапамога будзе выдавацца ў выглядзе грантаў і пазык пад нізкія працэнты, паведаміла інфармагенцтва Reuters. Па словах прадстаўніка Сусветнага банка Хольгера Крэя, чатыры краіны з найбольш пацярпелых ад нашэсця саранчы — Джыбуці, Эфіопія, Кенія і Уганда — неадкладна атрымаюць $160 млн. Ён таксама дадаў, што Емен, Самалі і іншыя пацярпелыя дзяржавы могуць прыцягваць сродкі па меры іх неабходнасці. Па звестках Сусветнага банка, саранча ахапіла больш чым два дзясяткі краін ва Усходняй Афрыцы, на Блізкім Усходзе і ў Паўднёвай Азіі, што стала найбуйнейшай успышкай за апошнія 70 гадоў. Чым пагражае глабальнае нашэсце?**

### Пражэрлівыя казуркі

Калі кажуць пра нашэсце насякомых, то нярэдка згадваюць біблейскія дзесяць кар егіпецкіх, гэта значыць бедствы, якія Усявышні наслаў на егіпцян за тое, што фараон не пажадаў вызваліць з рабства сыноў Ізраілевых. Дык вось самай жорсткай з усіх кар было якраз нашэсце саранчы ў 1300 годзе да н. э. Апісваецца, што тады казуркі пакрылі жывым дыванам зямлю, траву, дрэвы, і вельмі хутка не засталося ніводнага зялёнага лісціка.

Саранча і пазней станавілася прычынай вялікіх праблем многіх краін і народаў. Напрыклад, у 125 годзе да н. э. яна знішчыла ўвесь ураджай у Нумідыі і Кірэнаіцы, пасля чаго ад голаду памерла 800 тысяч чалавек. А ў 944 годзе ў Багдадзе наляцелых насякомых было так шмат, што яны засланілі сонца і з'елі ўсю зеляніну. І зноў усё скончылася страшным голадам і смерцямі.

Але самае магутнае нашэсце саранчы адбылося ў 1874 годзе ў амерыканскім Канзасе. За некалькі дзён у штаце была знішчана ўся зеляніна. Пасля таго як яе не засталося, пражэрлівыя казуркі пачалі есці... авечую поўсць (прычым проста на жывёлах!), вырабы са скуры і нават фарбу на платах. Саранчы было так шмат, што сваёй колькасцю яна тушыла вогнішчы, у якіх людзі збіраліся яе паліць! Вынайдзены фермерамі спецыяльны пыласос, які засмоктваў насякомых у скрынку, дзе яны гінулі, таксама аказаўся малаэфектыўны. У той страшны год саранча нанесла штату шкоду 200 мільёнаў долараў (тагачасных!). На шчасце, трыльёны лічынак загінулі ў выніку маразоў.

Пустынная саранча — разнавіднасць коніка, якую яшчэ называюць «кабылкай», — звычайна вядзе малаактыўны і адзіночны лад жыцця. Аднак калі арэал саранчы ўшчыльняецца — напрыклад, з памяншэннем колькасці раслліннасці ў месцы, дзе яна жыве, — «кабылкі» ператвараюцца ў статкавых насякомых. У гэтай фазе казуркі змяняюць афарбоўку і фарміруюць велізарныя чароды лятучых шкоднікаў.

Як сцвярджаюць у харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (Food and Agriculture Organization, FAO), нават сярэдняя па памерах зграя саранчы за дзень можа з'есці пасевы, якіх дастаткова, каб пракарміць 35 тысяч чалавек. Па звестках ААН, падчас апошняга значнага ўсплёску — рэзкага павелічэння колькасці зграй саранчы — у Заходняй Афрыцы ў 2003–2005 гадах быў знішчаны ўраджай на суму 2,5 мільярда долараў. Але масавыя нашэсці гэтых насякомых здараліся і ў іншыя гады — у 1930-х, 1940-х і 1950-х. Некаторыя з іх ахоплівалі адразу некалькі рэгіёнаў, зграі дасягалі велізарных памераў. Уявіце сабе суцэльную масу саранчы таўшчынёй каля 30 сантыметраў, якая пакідае пасля сябе мёртвую голую зямлю. Тут няма нічога дзіўнага, бо ў сярэднім вялізны рой, які складаецца з двух мільярдаў асобін агульнай вагой каля трох тон, накрывае сабой плошчы да 12 квадратных кіламетраў. У цэлым, паводле ацэнак FAO, пустынная саранча так ці інакш уплывае на жыццядзейнасць кожнага дзясятага чалавека на планеце, што робіць яе самым небяспечным у свеце мігрыруючым шкоднікам.

Рой саранчы настолькі велізарны, што з-за яго ў некаторых афрыканскіх краінах часта адмяняюць цягнікі, бо сутыкненне з казуркамі пагражае катастрофай. Афрыканцы называюць саранчу зубамі ветру з-за яе здольнасці ляцець з хуткасцю да 40 кіламетраў у гадзіну. Здаралася, што зграя раніцай пакідала Марока, а ў начы ўжо знаходзілася ў Партугаліі. Саранча не проста перамяшчаецца па паветры — яна робіць гэта настолькі шумна, што, па сведчаннях лётчыкаў, не чуваць, як працуе матор.

### Вельмі трывожна

Прычыны цяперашняга глабальнага нашэсця — цыклоны і залевы 2018–2019 гадоў. Пустынная саранча звычайна жыве ў засушлівых раёнах прыблізна трыццаці краін ад Заходняй Афрыкі да Індыі агульнай плошчай каля 16 мільёнаў квадратных кіламетраў. Але вільготныя, спрыяльныя ўмовы, якія склаліся два гады таму на поўдні Аравійскага паўвострава, дазволілі шкодніку інтэнсіўна размнажацца на працягу трох пакаленняў, сцвярджаюць эксперты ААН. Усплёск развіваўся з 2018-га. Да пачатку мінулага года першыя зграі саранчы накіраваліся ў Емен, Саудаўскую Аравію і Іран. Там яны працягнулі размнажацца і распаўсюдзіліся на Усходнюю Афрыку. Да канца 2019 года новыя зграі сфарміраваліся ў Эрытрэі, Джыбуці і Кеніі. Шкоднікі атабарыліся паабапал Чырвонага мора, дзе спусташалі Егіпет, Судан, Ірак і Емен, а таксама ўздоўж граніцы паміж Індыяй і Пакістанам. ААН ахарактарызавала сітуацыю як вельмі трывожную. У Егіпце, Эрытрэі, Саудаўскай Аравіі, Судане і Емене адбываецца актыўнае размнажэнне шкодніка, якое прывяло да разрастання зграй. Паводле асобных ацэнак экспертаў, колькасць саранчы павялічылася ў сотні разоў!

Эксперты ААН адзначаюць, што сёлета нашэсце стала асабліва буйным, паведаміў нямецкі тэлеканал Das Erste. Велізарныя зграі пустыннай саранчы праклалі сабе дарогу праз Афрыканскі Рог і Паўднёвую Азію. Акрамя афрыканскіх Кеніі, Самалі, Танзаніі, Уганды, Джыбуці, Эфіопіі, Паўднёвага і Паўночнага Судана і Эрытрэі, полчышчы насякомых дабраліся сёлета да манархій Персідскага заліва, а таксама Пакістана, Індыі, Бангладэш.

З нашэсцямі вельмі цяжка змагацца з-за вялізных плошчаў, якія пакрываюць насякомыя. Зграі саранчы на Афрыканскім Рогу яшчэ ўвесну дасягнулі беспрэцэдэнтных памераў і разбуральнага патэнцыялу. Краіны рэгіёна кінулі ўсе сілы на барацьбу з імі. Стрымліванне ўспышкі залежыць ад двух асноўных фактараў — маніторынгу і эфектыўнага кантролю.У FAO працуе служба інфармацыі пра пустынную саранчу. Яна дае прагнозы, мае сістэму ранняга апавяшчэння і папярэджання аб часе, месцы і маштабе нашэсця і размнажэння саранчы. Але калі папуляцыя дасягае крытычных узроўняў, такіх як на Афрыканскім Рогу, патрабуюцца экстранныя меры па яе скарачэнні, а таксама па прадухіленні фарміравання і распаўсюджвання новых навал.

### Дыджэі і войска

У Пакістане абвешчана надзвычайнае становішча. Там страты сельскай гаспадаркі ад саранчы могуць дасягнуць 2,2 мільярда долараў для азімых культур і 2,7 мільярда — для яравых. Мінсельгас краіны абвясціў нашэсце саранчы «катастрафічнай пагрозай для эканомікі, сельскай гаспадаркі і харчовай бяспекі Пакістана». Анамальна вялікая колькасць саранчы цяпер у Індыі, дзе мільярдныя полчышчы насякомых паглынаюць пасевы і рухаюцца да сталіцы краіны — Дэлі. Крытычная сітуацыя назіраецца ў шэрагу штатаў. Як паведамляе National Geographic, сельская гаспадарка Індыі і так панесла значныя страты пасля неўраджаю з прычыны мусонных дажджоў і пандэміі каранавіруса. А цяпер яшчэ і саранча можа з'есці ацалелыя пасевы.

Індыйскія фермеры ідуць на розныя хітрыкі для таго, каб адпудзіць рой саранчы ад сваіх пасадак. Напрыклад, можна выкарыстоўваць барабанны бой або гучную музыку. Адметна, што больш заможныя фермеры наймаюць для гэтых мэт дыджэяў. Па словах супрацоўніка індыйскага міністэрства сельскай гаспадаркі Аніла Шарму, якія цытуе нямецкі тэлеканал Das Erste, цяпер для Індыі настае вырашальны час: калі сітуацыю не ўдасца ўзяць пад кантроль да надыходу сезона дажджоў, краіну чакаюць вялікія праблемы. Ва ўмовах павышанай вільготнасці колькасць саранчы рэзка ўзрасце.

Іран выкарыстоўвае для змагання з нашэсцем шкоднікаў узброеныя сілы. Паведамляецца, што саранча пагражае знішчыць пасевы коштам больш за 7 мільярдаў долараў. Як заявіў афіцыйны прадстаўнік міністэрства абароны раслін Махамад Рэза Мір, саранча напала больш чым на 200 тысяч гектараў садоў і сельгасугоддзяў, паведаміла інфармацыйнае агенцтва ILNA.

Хоць цяпер вядуцца даследаванні больш экалагічна чыстых рашэнняў, такіх як біялагічныя пестыцыды або выкарыстанне натуральных ворагаў саранчы, найбольш распаўсюджаным метадам барацьбы з ёй застаецца распыленне традыцыйных пестыцыдаў. Гэта робіцца з дапамогай ручных помпаў, з самалётаў, беспілотнікаў, з наземных транспартных сродкаў. Такія меры дазваляюць знішчыць цэлыя зграі саранчы ў адносна невялікі прамежак часу.

Супрацьстаяць нашэсцю асабліва цяжка ў краінах і рэгіёнах, якія дзесяцігоддзямі не сутыкаліся з небяспечнымі крылатымі шкоднікамі, бо там няма ні інфраструктуры, ні калектыўнай памяці пра тое, як з імі змагацца. «Калі яны вяртаюцца, гэта можа прывесці да панікі», — заўважае старшы супрацоўнік FAO па прагназаванні саранчы Кіт Крэсман.

Калі цяперашні ўсплёск працягне перасякаць межы і запаўняць саранчой новыя рэгіёны, знішчаючы пасевы, ён можа быць абвешчаны бедствам.

### Другая хваля

Другая хваля нашэсця саранчы ва Усходняй Афрыцы выкліча сур'ёзныя наступствы на кантыненце, які таксама пакутуе ад успышкі каранавіруса. Пра гэта паведаміла BBC Swahili са спасылкай на заяву кіраўніка Афрыканскага банка развіцця. «Здаецца, што тыя, хто змог пазбегнуць COVID-19, сутыкнуцца з Locust-19 (нашэсцем саранчы. — **«Зв.»**)», — заявіў Адэсіна Аківумі. Апошняе, да чаго цяпер гатовая Афрыка, гэта недахоп харчавання, падкрэсліў ён. Па звестках FAO, 40 % ад 160-мільённага насельніцтва рэгіёна Афрыканскага Рога пакутуюць ад недаядання. Аднак пасля нашэсця саранчы харчовая бяспека пацерпіць яшчэ больш сур'ёзна.

Праграма інтэнсіўнай падрыхтоўкі разведчыкаў для назірання за перасоўваннямі раёў саранчы пры дапамозе лічбавай платформы eLocust3 запушчана ў Кеніі, заявіў старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы пры савеце губернатараў краіны Мутомі Нюкі. Пра гэта паведаміла Daily Nation. Пасля таго як даныя ўведзены ў сістэму, яны перадаюцца праз спадарожнік з палявога ўчастка ў нацыянальны цэнтр па барацьбе з саранчой, а таксама ў штаб-кватэру FAO ў Рыме ў рэжыме рэальнага часу. Мутомі Нюкі растлумачыў, што раней у многіх акругах кенійскія ўлады аказаліся не гатовыя да ўварвання пустынных насякомых і вымушаныя былі атрымліваць звесткі аб перамяшчэнні саранчы з мясцовых СМІ. Паводле яго слоў, разведчыкі змогуць даць дакладную інфармацыю з пацярпелых раёнаў, якая дапаможа ўраду прымаць адэкватныя рашэнні.

Алі Біла Вако, 68-гадовы фермер, які працуе на паўночным усходзе Кеніі, спадзяваўся на добры ўраджай збожжа ў гэтым сезоне, таму што дажджы завяршылі працяглы перыяд засухі. Але насякомыя знішчылі яго пасевы кукурузы і бабоў. «Саранча зжэрла большую частку нашых пасеваў, — з горыччу расказаў Вака карэспандэнту BBC. — А што не з'ела — засохла на корані. Гэта вельмі балюча. Нам так і не давялося пакаштаваць ежы, якая вырасла ў нас на вачах». Праўда, Вака глядзіць на праблему па-філасофску. «Такая Божая воля, — заўважыў кенійскі фермер. — Гэта Яго войска».

**Захар БУРАК.**

❍ ТЫМ ЧАСАМ

**ІЗРАІЛЬСКАЯ ФІРМА ПЕРАТВАРЫЛА «КАРУ ЕГІПЕЦКУЮ» Ў АРТЫКУЛ ДАХОДУ**

Ці хацелі б вы адчуць сябе Іаанам Хрысціцелем і, магчыма, народам Ізраіля, які 40 гадоў блукаў па пустыні? Тады ешце саранчу, прапануе кампанія Hargol FoodTech на поўначы Ізраіля, якая стала піянерам вырошчвання насякомых для масавага спажывання. У канцы мая кампанія выпусціла ў Злучаных Штатах два гатункі прадуктаў біблейскага бялку. Тых, хто недалюблівае насякомых, гэта, магчыма, здзівіць, але амерыканскія евангелісты скупляюць не толькі энергетычныя батончыкі, зробленыя з аўсянай мукі і перамолатай у парашок саранчы, але і цэлыя слоікі гэтых насякомых. Імі рухае жаданне харчавацца гэтак жа, як жыхары Святой Зямлі 2000 гадоў таму. Пра гэта расказаў Дрор Тамір, гендырэктар кампаніі «Харголь».

Саранча багатая бялком (каля 70 працэнтаў яе вагі), утрыманне вугляводаў у ёй нізкае, а тлушчу практычна няма. Яна таксама змяшчае вялікую колькасць жалеза, цынку, фоліевую кіслату, незаменную для цяжарных жанчын, амега-3, амега-6 і вітаміны. «Чаго там няма? Халестэрыну і насычаных тлушчаў», — адзначыў Тамір. І яшчэ там няма пестыцыдаў. Саранча, з якой «Харголь» вырабляе свае прадукты, вырошчваецца ў няволі і есць толькі свежую траўку. «Сельскагаспадарчая саранча — здаровая і экалагічная крыніца бялку», — дадае кіраўнік кампаніі. Выпуск прысмакаў на аснове саранчы — таксама ў планах кампаніі, а пакуль што Тамір спадзяецца, што вернікі будуць купляць гатовых да ўжывання цэльных насякомых, высушаных у духоўцы пры нізкай тэмпературы, каб захаваць пажыўныя рэчывы. Актыўнымі спажыўцамі могуць таксама стаць мілеміялы, якія клапоцяцца не толькі пра сваё здароўе, але і пра навакольнае асяроддзе.

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Ваш аптымізм і ўменне не паддавацца нудоце не толькі будуць вельмі карысныя вам самім, але і выклікаюць сімпатыю ў навакольных. У пачатку тыдня з'явіцца выдатная магчымасць бліснуць талентамі, выступіць на публіцы, падняць свой аўтарытэт. Тыдзень можа падарыць ажыццяўленне планаў. Таксама можа з'явіцца магчымасць змяніць работу, калі, вядома, вы гэтага хочаце. У суботу добра адпраўляцца ў падарожжа.

**ЦЯЛЕЦ.** У першыя тры дні тыдня імаверныя рэзкія перапады настрою, хоць асаблівых прычын для гэтага не прадбачыцца. Неабходна завяршыць пачатыя справы, яны пагражаюць павіснуць мёртвым грузам надоўга. Не вельмі давярайце парадам добразычліўцаў, больш спадзявайцеся на сябе. Бліжэй да выхадных асабліва ўважлівымі неабходна быць тым, хто адпраўляецца ў далёкую паездку, аднак не варта бачыць у кожным чалавеку ворага. Паспрабуйце больш часу праводзіць з блізкімі людзьмі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Чакаецца поспех у прафесійных справах, атрыманне дадатковага прыбытку. Асабістае жыццё таксама парадуе. Нават у складаных сітуацыях не адчайвайцеся — атрымаеце тое, пра што марылі. Цуды сапраўды здараюцца, вы ў гэтым пераканаецеся на ўласным вопыце ў найбліжэйшы час.

**РАК.** У вас пачалася палаcard шанцавання і лёгкіх поспехаў. Сіл і энергіі хопіць для рэалізацыі задуманага. Давер партнёрам — добрая рыса характару, але часам лепш яшчэ раз пераканацца ў іх надзейнасці. У сераду вашы прапановы будуць пачуты і адобраны начальствам. Але чацвер і пятніца могуць аказацца самымі напружанымі і цяжкімі днямі тыдня, якія запатрабуюць максімальнай засяроджанасці. Затое ў выхадныя можна будзе расслабіцца на прыродзе.

**ЛЕЎ.** Паспрабуйце быць мякчэйшымі, чым звычайна, асабліва ў адносінах з калегамі па рабоце і начальствам. Аўторак — удалы дзень для пачатку новых важных спраў, вырашэння праблем у сферы партнёрскіх адносін. Надыходзіць новы этап у жыцці. У рабоце спатрэбіцца поўная аддача і выкарыстанне ўсіх вашых ведаў, а можа быць, і тых, якія толькі трэба будзе набыць. Бліжэй да выхадных будуць ўдалыя як дзелавыя паездкі, так і падарожжа з мэтай адпачыць.

**ДЗЕВА.** Тыдзень абяцае быць яркім і запамінальным, калі не па выніку дзейнасці, то, як мінімум, па сваім эмацыянальным напале. Цяпер самы час адкінуць надакучлівыя справы і адправіцца на пошукі новых уражанняў і цікавых знаёмстваў. Асабліва прыдатнымі для гэтага могуць аказацца аўторак і пятніца. У суботу пажадана праявіць абачлівасць. У гэты дзень небяспечна сварыцца, потым будзе вельмі цяжка памірыцца.

**ШАЛІ.** Пры ўмелым спалучэнні аптымізму і гібкасці на гэтым тыдні вы зможаце дасягнуць важнай мэты. Працуйце, і прафесійны поспех забяспечыць вам годнае існаванне, не кажучы ўжо пра маральнае задавальненне. Звярніце ўвагу на інтэлектуальную сферу дзейнасці — у ёй вас чакае поспех. У пятніцу пажадана пазбягаць канфліктаў. У сям'і паспрабуйце праяўляць стрыманасць, інакш можаце справакаваць скандалы.

**СКАРПІЁН.** З'явіцца шанц прадэманстраваць захопленым гледачам усю глыбіню і сілу вашай асобы, зрабіўшы прыгожы жэст. Але паспрабуйце не толькі выказвацца, але і прыслухоўвацца да суразмоўцаў. Далоў стэрэатыпы — варта сканцэнтравацца на самым важным. Вы зможаце дамагчыся поспеху, атрымаць салідны прыбытак і апынуцца ў першых шэрагах.

**СТРАЛЕЦ.** Каб зрабіць тое, што вы намецілі, спатрэбяцца пэўныя намаганні і ўпэўненасць ва ўласных сілах і дзеяннях. Вашы амбіцыі прымусяць рухацца наперад, да новых вяршынь. У сераду будуць удалымі паездкі, перамовы і работа з юрыдычнай дакументацыяй. Пятніца будзе спрыяльная для завяршэння старых спраў і для новых цікавых праектаў. Кароткачасовае падарожжа ў выхадныя абяцае казачны адпачынак у кампаніі.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень спрыяе мернаму вядзенню спраў, павольнаму, але вернаму руху наперад у прафесійнай сферы, умацаванню пазіцый. Не варта нічога змяняць, задавальвайцеся пакуль тым, што маеце. Самы час разабрацца з абавязкамі і ўрэгуляваць адносіны з партнёрамі. Запасіцеся цярпеннем, будзьце больш сціплыя ў сваіх патрабаваннях. Паспрабуйце стрымліваць раздражненне, якое можа з'явіцца ў адносінах да блізкіх, калі тыя не заўсёды вас разумеюць.

**ВАДАЛІЎ.** Шматабяцальны і творчы тыдзень. Калі вы хочаце знайсці новую работу і новых сяброў, то цяпер самы час. Вашы ідэі будуць прыняты і падтрыманы начальствам і калегамі. Паездкі за горад лепш планаваць на пятніцу. У нядзелю магчымая нефармальная сустрэча, ад яе будуць залежаць многія наступныя падзеі ў дзелавой сферы. Сітуацыя ў гэты дзень спрыяльная, і поспех практычна гарантаваны.

**РЫБЫ.** Тыдзень пройдзе ў спакойным тэмпе, калі, вядома, вы з уласнай ініцыятывы не будзеце спяшацца і ствараць сабе лішнія праблемы. Паспрабуйце рэальна разлічваць свае сілы, не ўзвальваць на сябе лішнюю работу і цяжкія абавязацельствы. Досціп дазволіць убачыць сітуацыю, якая склалася, з іншага боку і знайсці арыгінальны спосаб яе рашэння. Усміхайцеся і верце ў лепшае.

## Даты | Падзеі | Людзі

**13 ЧЭРВЕНЯ**

У краіне

**1775** год — нарадзіўся Антоні Генрык Радзівіл, палітычны дзеяч, мецэнат, кампазітар-аматар, спявак. Выступаў за кааліцыю Прусіі, Расіі і Аўстрыі супраць Напалеона, стварэнне асобнай арміі з жыхароў былой Рэчы Паспалітай. Трымаў у Берліне і Познані артыстычныя салоны. Быў выдатным віяланчэлістам і гітарыстам, пісаў музыку, спяваў у аматарскіх спектаклях, пісаў рамансы, вакальныя дуэты, фартэпіянныя творы. Стаў вядомы як кампазітар оперы «Фаўст».



**1890** год — нарадзіўся (цяперашні Бялыніцкі раён) Віталь Уладзіміравіч Сушчынскі, адзін з першых расійскіх ваенных і савецкіх палярных лётчыкаў. Кавалер Георгіеўскіх крыжоў трох ступеняў. У 1930-м і 1937-м рэпрэсаваны. Памёр у 1938-м. Рэабілітаваны пасмяротна.

**1905** год — нарадзіўся Лазар Львовіч Шапіра, беларускі празаік. Аўтар аповесцяў «Напагатове», «Кіпучыя дні», п'есы «Народжаныя лётаць», нарысаў і апавяданняў, сцэнарыя дакументальнага фільма «На варце Радзімы».

**1920** год — нарадзіўся Мікалай Сцяпанавіч Цыбульскі, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944, пасмяротна).

**1945** год — нарадзіўся Уладзімір Клаўдзіевіч Вараб'ёў, беларускі вучоны ў галіне пажарнай бяспекі, педагог, кандыдат хімічных навук, прафесар.

У свеце

**1815** год — нарадзіўся Восіп Іванавіч Сомаў, рускі матэматык і механік, акадэмік Пецярбургскай АН. Аўтар арыгінальнага курсу «Рацыянальная механіка». Узнагароджаны трыма Дзямідаўскімі прэміямі.

**1825** год — жыхар Нью-Ёрка Уолтэр Хант запатэнтаваў бяспечную шпільку. Зрабіць гэта яго прымусіла неабходнасць пакрыць доўг у 15 долараў. Падумаўшы на працягу трох гадзін і зрабіўшы эскіз, ён прадаў правы на сваё вынаходніцтва за 400 долараў.

**1865** год — нарадзіўся Уільям Батлер Ейтс, ірландскі паэт, драматург. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры 1923 года «за натхнёную паэтычную творчасць, якая перадае ў высокамастацкай форме нацыянальны дух».



**1895** год — у Францыі прайшлі першыя ў свеце аўтамабільныя гонкі. Хутчэй за ўсіх шлях з Парыжа ў Бардо і назад перадолеў Эміль Левасо. Сярэдняя хуткасць машыны пераможцы склала 24 кіламетры ў гадзіну.

**1940** год — нарадзіўся Гойка Міціч, югаслаўскі кінаакцёр, рэжысёр і каскадзёр, які стаў вядомы як выканаўца роляў індзейцаў у фільмах студыі DEFA. Усяго сыграў у 15 карцінах.

**1970** год — заснавана Азіяцкая будысцкая канферэнцыя за мір.

**2000** — у Пхеньяне прайшла першая за час існавання дзвюх дзяржаў сустрэча лідараў КНДР і Паўднёвай Карэі — Кім Чэн Іра і Кім Дэ Чжуна.

Так гаварыла...

**ПІФАГОР:**
*«Жыццё падобнае да ігрышча: адны прыходзяць на іх спаборнічаць, другія — гандляваць, а самыя шчаслівыя — глядзець».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.37 | 21.42 | 17.05 |
| Віцебск | — 4.18 | 21.41 | 17.23 |
| Магілёў | — 4.27 | 21.33 | 17.06 |
| Гомель | — 4.33 | 21.20 | 16.47 |
| Гродна | — 4.54 | 21.56 | 17.02 |
| Брэст | — 5.04 | 21.47 | 16.43 |

**Месяц**

*Апошняя квадра ў 9.23.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Ермія.*
***К.*** *Вольгі, Антона, Германа, Люцыяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Мама выйшла на вуліцу без парасона, а бачыш, які страшны дождж пайшоў, — заклапочана кажа бацька дачцэ.**
**— Не хвалюйся, тата, я думаю, яна паспела забегчы ў якую-небудзь краму і перачакае там дождж.**
**— Вось гэтага я і баюся, дачушка.**

Прашу паслаць мяне на курсы павышэння зарплаты.

**Першым вітаецца той, у каго слабейшыя нервы.**

Жанчыны звяртаюць увагу не на прыгожых мужчын, а на мужчын з прыгожымі жанчынамі.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1845.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 чэрвеня 2020 года.